Cana 10 hr.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 18 (659). Wilnia, Niadziela 26 Krasawika 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Padpiska u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

„Да людзей тупых і да людзей злой волі"

Віленскае «Słowo», орган тутэйшых манархістых, у № 87 з дня 28.III.36 пад гэткім загалоўкам памясьціў артыкул нейкага А. П. К.

Артыкул гэты аўтар пасьвячае двум катэгорыям сваіх чытачоў: людзям тупым, каторыя самі не прызнаюць камуністычнай небясьпекі і людзям злой волі, каторыя ўгаварваюць іншым, што такая небясьпека ня йснуе.

Галоўны зьмест артыкулу наступны:

— Ад пачатку сёлетняга 1936 г. у Віленскім Акружным Судзе адбылося 10 масавых камуністычных працэсаў, з лічбай абвінавачаных 98 чалавек. Былі гэта людзі featured рознага веку, рознай асьветы, рознай нацыянальнасьці. Апрача гэтага бадай штодня адбываюцца такія-ж працэсы над адзінкамі. Агулам, ня лічачы Апэляцыі й Судовых працэсаў выязных, правінцыяльных, ад пачатку сёлетняга году прайшло праз лаву абвінавачаных каля 200 асоб, суджаных за прыналежнасьць да КПЗБ.

Большасьць абвінавачаных паходзіць з паветаў: Слонімскага, Навагрудзкага, Косаўскага, Пінскага, Баранавіцкага і часткова з ваколіц Дзісны й Глыбокага.

Паводле нацыянальнасьці абвінавачаныя выглядаюць гэтак: жыдоў — 59 прац., беларусаў — 31 прац., палякоў — 5 прац., расейцаў — 3 прац. і літоўцаў — 2 прац.

Паводле асьветы: з вышэйшай — 17 прац. з сярэдняй — 11 прац., з рознага роду пачаткавай — 72 прац.

Аграмадная большасьць — гэныя 72 прац. — гэта цёмныя работніцкія масы, а ў іх лічбе бадай усе беларусы, якіх у партыі падвучылі крыху Маркса і загадалі лятуцець аб колектыве. Кіраўнічая роль над гэнымі масамі належа да жыдоў.

Вось-жа людзі тупыя ўважаюць, што гэныя 200 асоб абвінавачаных у камуністычнай рабоце не такія грозныя для Польшчы, каб з іх прычыны падымаць алярм, а людзі злой волі [сьведама небясьпеку пакрываюць. —

Гэтак агульна выглядае зьмест успомненага артыкулу. А якая-ж мэта яго? — Хіба яшчэ больш зактывізаваць барацьбу з камунізмам у нашым краі. А як-жа гэту барацьбу праводзіць? — Хіба-ж спосабамі паліцыйнымі, бо трудна спадзявацца, каб паны-манархісты патрапілі здабыцца на нейкую іншую барацьбу. А калі так, дык гэны зварот: «да людзей тупых і да людзей злой волі» якраз і адносіцца да самых пісакаў у «Słowie» і да ўсіх тых, хто так думае, як яны. Справа ў тым, што кожны ідэовы рух, прыемны каму ці не, аднэй толькі сілай здушыць ніколі няможна, як няможна такжа тлумачыць яго паўстаньне аднэй толькі цемнатой і нечай злой воляй.

Апрача гэтага, прадусім трэба ведаць, што тыя ўсе беларусы, якія абвінавачваюцца ў нас у камунізьме, часта ідэолёгічна камуністамі не зьяўляюцца. У многіх выпадках ёсьць гэта беларускія нацыянальныя вясковыя дзеячы, у сэнсе соцыяльным радыкальныя. А розныя нашы «прыяцелі» прышываюць ім латку камунізму, і тады ўжо справа йдзе проста: «Докажите, что вы не верблюд?» Гэта ёсьць многіх людзей адзін са спосабаў барацьбы ня толькі з камунізмам, але так-жа і з беларускім нацыянальным рухам. Што ня ўсе абвінавачаныя ў камунізьме бываюць камуністамі, служа, між іншым, доказам і тое, што Суд гэткіх часта апраўдывае.

Калі-ж ідзе аб сапраўдныя спосабы барацьбы з камунізмам сярод беларусаў, дык, паводле нас, першым з іх будзе правядзеньне радыкальнай зямельнай рэформы і бясплатнае надзяленьне зямлёй беззямельных і малазямельных, а так-жа дапамога ім загаспадарыцца.

Другім спосабам будзе беларуская школа на кошт дзяржавы. Праўда, многія польскія палітыкі заяўляюць, што беларускія сяляне беларускай школы ня хочуць. Але што гэткая іх — шчырая ці ня шчырая думка — цалком беспадстаўная, служыць доказам школьная акцыя сярод беларускіх гушчаў, якая цяпер адбываецца, а якая вымоўна сьведча аб нязломнай волі беларускага народу мець сваю родную школу.

Трэцім спосабам барацьбы з камунізмам будзе беларуская пазашкольная асьветная праца. Праўда, могуць тут нам сказаць, што маецe свае прасьветныя арганізацыі, свае гурткі й праз іх праводзьце пазашкольную асьвету. Так, але ключ гэтай працы сяньня знаходзіцца цалком у руках адміністрацыйных уладаў і каб гэная праца належна разьвівалася, трэба, каб гэныя ўлады зьмянілі свае да яе адносіны на лепшыя.

Чацьвертым, урэшце, спосабам барацьбы з камунізмам сярод беларусаў гэта будзе доступ мясцовых людзей на розныя дзяржаўныя й самаўрадовыя пасады.

Гэткая наша рада людзям тупым і вострым, людзям злой і добрай волі...

Беларускім нацыянальным, палітычным, культурна-асьветным, гаспадарчым і іншым арганізацыям і інстытуцыям

Камунікат.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, згодна з арт. 14 Рэгуляміну БНК-ту, гэтым апавяшчае абнаўленьне Беларускага Нацыянальнага Камітэту на 1936-37 год.

Дзеля гэтага:

1. Беларускія нацыянальныя, палітычныя, культурна-асьветныя, гаспадарчыя й іншыя арганізацыі й інстытуцыі, згодна з арт. 3 Рэгуляміну БНК-ту павінны выдэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у Бел. Нац. К-т — палітычныя па трох, а ўсе іншыя па двух.

2. Паўнамоцтвы дэлегатаў Прэзыдыюм К-ту будзе прыймаць да дня 8 траўня сёлета ўключна.

3. Выдэлегаваныя прадстаўнікі ў Беларускі Нацыянальны Камітэт на 1936-37 год павінны сабрацца на першы агульны сход абноўленага Камітэту дня 10 траўня сёлета а гадзіне 15-ай у памешчаньні пры Завальнай вул. № 1—1 у Вільні.

4. Беларускія арганізацыі, якія не належаць да Бел. Нац. К-ту, але жадаюць прыняць участце ў гэтай агульна-беларускай нацыянальнай арганізацыі, павінны, згодна з арт. 5 Рэгуляміну Бел. Нац. К-ту, падаць Прэзыдыюму К-ту свае заявы.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту

(—) *Я. Пазьняк* — Старшыня
(—) *Мгр. М. Шкялёнак* — I-шы Віцэ-Старшыня
(—) *Інж. Л. Дубейкаўскі* — II-гі Віцэ-Старшыня
(—) *Інж. А. Клімовіч* — Скарбнік
(—) *Ул. Казлоўскі* — Сакратар.

Вільня, дня 19 красавіка 1936 г.

Z dziejnaści Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury

Šalciny, Brasłaŭskaha paw. Hadawaja sprawazdača z dziejnaści Hurtka BIHiK u Šalcinach za 1935 hod.

Šalcinaŭski Hurtok dnia 2 lutaha 1935 h končyŭ čaćwiorty hod samatužnaj pracy na niwie haspadarčaj i kulturna-praświetnaj. Kali hlanuć na dziejnaść hurtka za minuły 1935 h., dy brać pad uwahu wyklučna lik tych ci inšych kulturna-praświetnych imprezaŭ, dyk praca hurtka budzie pradstaŭlacca ŭ ličbach niewialikich, adnak jany źjaŭlajucca žywym dokazam, jak „lohka" pracawać našamu hurtku na niwie kulturna-praświetnaj ci haspadarčaj. Padajom niekatoryja fakty:

1. Pieradusim na paradku dnia ŭ prošłym hodzie stała ŭ nas arhanizawańnie ŭračystaha światkawańnia 17-tych uhodkaŭ Abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi z publičnym referatam, adpawiednymi deklamacyjami i śpiewami. Ale jak u minułych 3 hadoch, tak i ŭ čaćwiortym hodzie brasłaŭskaje starastwa na publičnaje światkawańnie nie dało dazwołu „ze względów bezpieczeństwa". Światkawańnie adbyłosia tolki ŭ kružku siabroŭ, sympatykaŭ hurtka j haściej.

2. Potym pryjšło arhanizawańnie spektaklu-wiečaryny dnia 30.III.35 h. u w. Račniowa, Leonpolskaj woł. Mielisia adyhrać „Paŭlinku" J. Kupały i pratancawać na scenie bieł. narodny taniec „Lawonichu". Adnak starastwa iznoŭ nie dało dazwołu (zabaronu atrymaŭ hurtok za 3 hadz. pierad spektakl-wiečarynaj), matywujučy adkaz „nieodpowiednim lokalem". Treba adznačyć, što ŭ hetym „nieodpowiednim lokalu" polskija koły raniej ładzili pradstaŭleńni.

3. U dalejšym było arhanizawańnie spektaklu-wiečaryny ŭ Šalcinach z „Ptuškaj Ščaścia" Fr. Alachnowiča j deklamacyjaj wieršaŭ. Uznoŭ starastwa nie dało dazwołu — matywujučy adkaz sławami: „ten lokal nie odpowiada warunkom bezpieczeństwa publicznego". U 1933 h. dnia 1 studnia hurtok, majučy pazwaleńnie hetaha-ž brasłaŭskaha starastwa ładziŭ spektakl-wiečarynu ŭ wyšmienawanym „lokalu". Musimo adznačyć, što ŭ 1929 hodzie ŭ hetym-ža „lokalu" była škoła, dy j siańnia ŭ hetkich samych „lokalach" mieściacca ŭ Šalcinach až dźwie škoły.

4. Jak wiedama Centrali, my ŭ prošłym hodzie padali ŭ Drujskuju wałasnuju radu prośbu pryjści j nam z matarjalnaj dapamohaj, jak heta robicca polskim „kołam". Adnak było nam adkazana, što našaja prośba „nie przyjęta do wiadomości", bo napisana pabiełarusku (hl. „B. Krynicu" Nr. 5 1935 h.). Paśla pratestu ŭ starastwie prociŭ nie pryznawańnia Drujskaj wałasnoj uprawaj h. zw. jazykowych ustawaŭ, my iznoŭ padali ŭ wałasnuju radu prośbu, adnak na hety raz wałasnaja ŭprawa nie dała nijakaha adkazu...

5. Samatuham sarhanizawali chatniaje nawučańnie dla darosłych u miesiach lutym i sakawiku. Z hetaha nawučańnia karystała 10 asob.

6. Pašyrali bieł. drukawanaje słowa: hazety, časapisy i knižki. Asabliwuju ŭwahu źwiernlena na tyja miascowaści, dzie jašče słaboje biełaruskaje ŭświedamleńnie.

7. Adbyłosia šeść pasiedžańniaŭ Uradu hurtka: 10.I; 10.III; 20.VI; 24.VII; 5.VIII; 19.XII.

240364

8. Na ahulnym schodzie siabroŭ hurtka dnia 13 lutaha 1936 hodu wybrany nowy Urad u nastupnym składzie: staršynia — Alena Aniśka z Šalcin, sakratar — Jazep Urbanowič z Cileŭščyny, skarbnik — Piatro Čwiačkoŭski z Šalcin, zastupniki — Felicyja Cwiačkoŭskaja z Šalcin i Piatro Kaškur z Račniowa, Leonpolskaj woł.

Zahadčykam biblijateki - čytalni źjaŭlajecca Alena Aniśka. Hurtok i nadalej mieścicca ŭ domie hr. Cypryjana Karalonka ŭ Šalcinach.

9. Stan kasy hurtka: prychod — 8,46 zł., raschod — 8,15 zł., saldo — 0, 31 zł.

Uwachodziačych papieraŭ było šeść (6), wychodziačych — dziesiać (10).

10. U 1936 h. hurtok pastanawiŭ prystupić da pracy z bolšaj enerhijaj, a na ŭsialakija zabarony sa starany starastwa reahawać adklikańniem da adpawiednych wyšejšych uładaŭ. Adnačasna hurtok pastanawiŭ uziać jak najbolšaje ŭčaście ŭ školnym plebiscycie, padhataŭlajučy da hetaj akcyi hrunt praz publičnaje pračytańnie adpawiednych referataŭ i pašyrańnie litaratury.

Začynili hurtok Bieł. Inst. Hasp. i Kultury. Wielmi dziejny hurtok Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ w. Ladkoch, Staŭpieckaha paw. administracyjnyja ŭłady hetymi dniami začynili.

U hetaj sprawie Staŭpieckaje starastwa dnia 6 krasawika 1936 h. wydała hetkuju pastanowu:

„Z chwilą doręczenia niniejszej decyzji zawiesić działalność oddziału Białoruskiego Instytutu Gospodarki i Kultury w Ladkach i oddział ten rozwiązać".

Takim čynam dziejnaść hurtka BIHiK u Ladkach „zawiešana", a hurtok „raźwiazany".

Suproć hetaj pastanowy starastwa padana apelacyja, ale ci jana što pamoža...

Pamior Dr. Amende

Dnia 15 krasawika sioleta nahła pamior u Pekinie dr. Ewald Amende, wiedamy arhanizatar i sakratar eŭrapejskaha Kanhresu Nacyjanalnych Mienšaściaŭ.

Dr. E. Amende z pachodžańnia byŭ niemcam, radziŭsia 22 XII 1892 h. u Estonii.

Niabožčyk wielmi dobra znaŭ pałažeńnie niedziaržaŭnych sławianskich narodaŭ, u tym liku i pałažeńnie Biełaruskaha narodu. Znaŭ jon imknieńni Bielarusaŭ nia tolki teoretyčna, ale bačyŭ hetyja imknieńni i nawočna — bywaŭ niaraz u našym kraju i pryhladaŭsia biełaruskamu žyćciu.

Śmierć zachapiła jaho padčas adnoj z biazupynnych padarožaŭ pa świecie.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Сход Рады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У нядзелю дня 26 красавіка сёл. а гадз. 16-ай у памешканьні ўласным пры Завальнай вул. № 1—1 адбудзецца Сход Рады Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры. Прысутнасьць усіх сяброў Рады абавязкавая.

Лекцыя і песьні. У нядзелю дня 26 красавіка сёл. а гадз. 18 у памешканьні Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры пры Завальнай 1—1 Кс. В. Гадлеўскі прачытае публічную лекцыю на тэму „*Разьвіцьцё старадаўнай беларускай мовы ад XIII да XVI стагодзьдзя.*" Пасьля лекцыі хор Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры будзе сьпяваць беларускія народныя песьні, а так-жа будуць дэклямавацца беларускія вершы.—Уход вольны і бясплатны.

Арышт вучняў Беларускай Гімназіі ў Вільні. Перад самым Вялікаднем сёлета паліцыя арыштавала 6 вучняў Беларускай Філіі дзяржаўнай гімназіі ім. Ю. Славацкага й аднаго былага вучня Булгака, падазраючы іх у камунізьме. Шасьцёх арыштаваных вучняў, пратрымаўшы суткі, выпусьцілі на волю, а Булгака затрымалі й пасадзілі на Лукішках у вастрог.

Uwaha, Biełarusy — katalikil— Kalwaryja — 7 červienia. Na adbytym anahdaj pasiedžańni Biełaruskaha Kaścielnaha Kamitetu pastanoŭlena było arhanizawać sioletniuju biełaruskuju pilihrymku ŭ Kalwaryju na dzień 7 červienia (Trojca). Padrobnyja dadzienyja ab hetym buduć apublikawany paźniej.

Цяжкі стан беларускай вучнёўскай моладзі. У сувязі з немагчымасьцяй аплаты апошняй раты за навуку ў Беларускай Філіі дзяржаўнай гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні звольнены з лекцыяў 20 вучняў гэтай гімназіі, пераважна з вышэйшых клясаў. Падобны лёс спаткаў таксама апошнім часам соткі беларускай школьнай моладзі і ў іншых школах Польшчы. Часовая помач для гэтай моладзі ёсьць зараз-жа патрэбнай, але трывалае палепшаньне сытуацыі было-б магчымым толькі ў выпадку ўвядзеньня ў нас спэцыяльных такс, адпавядаючых даходу мяйсцовых гаспадарак і наагул варштатаў працы

„Маладая Беларусь." Даведваемся, што „Маладая Беларусь" мае быць органам беларусаў-польскіх чыноўнікаў і кандыдатаў у чыноўнікі. Наступны нумар гэтага журналу мае быць ідэолёгічна выразьнейшы і ясьнейшы.

Hramadzianie Biełarusy!

Idzie woś jasnaja para,
Prawidu świecić nam zara,
Ajčyna — Maci — Biełaruś,
Haroj, żywa!..
(Z „Hymnu rodnaj ziamli").
„Maja Lira".

6-ha traŭnia sioleta minaje 10 hadoŭ ad času, kali nawieki pierastali dychać chworyja hrudzi piaŭca „Liry", biełaruskaha paeta, filozafa j narodnaha dziejača Kizimiera SWĄJAKA — Ks. Kastantaha Stepowiča.

Doŭh udziačnaści dla paeta j abawiazak pierakazańnia jahonych ideałaŭ padrastajučamu pakaleńniu nakazwajuć kožnamu Biełarusu adznačyć prypadajučyja ŭhodki ŭ mieru sił i mahčymaściaŭ. — Kab ablahčyć heta zadańnie dla ahułu hramadzianstwa, nižejpadpisanyja ŭziali na siabie inicyjatywu sarhanizawańnia światkawańnia prypadajučych uhodkaŭ pawodle nastupnaj prahramy:

1. Sierada 6-ha traŭnia (uhodki śmierci) 1936 h. a hadz. 7½ załobnaje nabaženstwa ŭ kaściele św. Mikałaja ŭ Wilni;
2. Piatnica 8-ha traŭnia (uhodki pachowin) 1936 h. a hadzinie 7-aj, załobnaje nabaženstwa ŭ rodnym parachwijalnym kaściele niabožčyka ŭ Kluščanach, Świancianskaha paw.
3. Subota 6-ha červienia 1936 h. a hadz. 18-aj paświačańnie j adčynieńnie pamiatnika nad hrobam paeta na Wilenskich Rossach. Zaraz-ža paśla paświačeńnia pamiatnika adbudziecca **Załobnaja Akademija** ŭ zali Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury pry Zawalnaj wul. Nr.1—1 ŭ Wilni.

Padajučy ab usim hetym da publičnaha wiedama, zaklikajem usio biełaruskaje hramadzianstwa pryniać asabistaje ŭčaście ŭ pradbačanych uračystaściach i hetym wykazać pašanu dla nieśmiarotnych zasłuhaŭ pradčasna pamioršaha Kazimiera S w a j a k a.

Ś w i a t k a w a l n y K a m i t e t.

(—) Michaś Mašara. (—) Inž. L. Dubiejkaŭski. (—) Ks. A. Stankiewič.
(—) Jan Stepowič. (—) Inž. A. Klimowič.

Wilnia, 5 krasawika 1936 h.

P. S. Kab wykupić pamiatnik i swajačasna pastawić jaho na miescy, patrebny jšče značnyja hrašowyja sumy, jakija zdabyć možna tolki šlacham dabrawolnych składak i achwiar. Dwojčy daje, chto chutka daje. Dziela hetaha chaj nichto nie admowicca jak najchutčej złažyć mahčymuju achwiaru na čekawaje konto P.K.O. Nr. 180.485 inž. A. Klimowiča — Wilnia, z zaznačeńniem na adwarotnaj staranie siaredniaj časci pierasylnoha blankietu „na pamiatnik Swajaku"

Nowaja partyja?

Źjezd sajuzaŭ b. wajakoŭ u Waršawie

Nadowiačy ŭ Waršawie adbyŭsia wialiki źjezd pradstaŭnikoŭ sajuzaŭ b. polskich wajakoŭ. Na hetym źjeździe byli pradstaŭniki ŭradu j armii. Pradmietam naradaŭ źjezdu byli aktualnyja palityčnyja j ekanamična-haspadarčyja sprawy. Zjezd b. wajakoŭ pryniaŭ rezalucyju, u jakoj padčyrkiwaje nieabchodnaść stwareńnia ŭ Polščy nowaj palityčnaj partyi z wyraznaj prahramaj pawodle ideolohii niabožčyka marš. J. Piłsudskaha.

Pry hetym u rezalucyi adznačana, što ŭ hetaj arhanizacyjnaj pracy element b. wajakoŭ pawinien adyhrać pawažnuju rolu.

Apazycyjnyja hazety apiswajučy narady hetaha źjezdu ćwierdziać, što sanacyja choča adnawić źlikwidawanaje BB, ale pad inšaj ŭžo firmaj.

Trudna adnak spadziawacca, što nowaja partyja hetkaha charaktaru budzie mieć apiryšča ŭ šyrokich polskich narodnych masach. Žyćcio idzie ŭpierad i nikoli nie waročajecca nazad.

КНІГАПІС

С. Паўловіч — **ПЕРШЫЯ ЗЕРНЯТКІ. Беларуская граматка для хатняга навучаньня. Вільня, 1936. Выданьне Язэпа Малецкага. Бач. 96, 24×17, цана 50 гр.**

Даўно ўжо адчувалася ў беларускім народзе на гэты бок польска-савецкай граніцы вялікая патрэба падручніка пазашкольнага навучаньня. Як тут выглядае справа з беларускай школай, усе добра ведаем. Тымчасам гон народу да роднай граматы вялікі. Тыя ўсе для гэтай мэты чытанкі й кніжыцы, якія ёсьць, надта мала або й сусім не датасаваны для навучаньня й карысьць з іх невялікая.

Ужо ад некалькі гадоў здаралася спаткацца з чуткай, што Сяргей Паўловіч, ведамы дазнаны пэдагог, былы дыр. Бел. Гімназіі ў Вільні, рыхтуе беларускі пасобнік для хатняга навучаньня, уложаны паводле вымогаў дыдактыкі й пэдагогікі.

Паўгода таму, можна ўжо было пацяшацца тым, што гэткі пасобнік хутка пакажацца ў сьвет, бо ўжо друкуецца. Урэшце, пара тыдняў таму, віленскія беларусы мелі шчасьце прывітаць „Першыя Зерняткі", граматку для хатняга навучаньня. Ёсьць гэта першая такога роду кніжыца, прызначаная для беларускага народу, што знаходзіцца на захад ад польска-савецкай граніцы.

З прыемнасьцяй бяром „Першыя Зерняткі" ў рукі й разглядаем. Кідаецца прадусім у вочы агулам чыстае, стараннае выкананьне. Стройная вокладка й стылізаваныя літары загалоўку і адпаведны малюнак. На другой бачыне вокладкі ўвагі, як вучыць чытаць і пісаць. У кніжцы аж 137 малюнкаў ведамых беларускіх мастакоў: У. Паўлюкоўскага, Я. Драздовіча й М. Васілеўскага. Малюнкі агулам стройныя, арыгінальныя, узяты з беларускага быту й гісторыі.

Агульны зьмест граматкі наступны: часьць букварная, Беларусь і беларусы, прырода і праца на Беларусі, культура і поступ, вучэньне сьвет — нявучэньне цьма.

Граматка ўложана мэтадам сынтэтычным, як найбольш у дадзеным выпадку адпаведным. Сутнасьць яго ў тым, што вучань ад азнаямленьня з буквамі, мінаючы звычайнае чытаньне па складах (сылябізаваньне), пераходзіць адразу да чытаньня зложаных з гэтых букваў цэлых слоў: аднаскладовых, двухскладовых, многаскладовых і наканец цэлых сказаў. Пры гэтым аўтар срога трымаўся ведамай у пэдагогіцы дарогі: ад лёгкага й простага да больш цяжкога й складанага.

Прыемнае так-жа робіць уражаньне ідэйны бок граматкі. Спатыкаем тут выразна беларускі народны, сялянскі, працоўны характар, беларускі быт, беларускую прыроду, беларускую культуру. З чытанкі беларусы ня толькі навучацца чытаць, але навучацца шмат карысных весгах, а так-жа набяруцца з яе культурнага настрою.

Дужа добра аўтар зрабіў, што апрача вершаў нашых старых паэтаў клясыкаў: Купалы, Коласа і інш., даў цэлы рад вершаў маладых нашых паэтаў і да таго тутэйшых, што жывуць і пішуць на гэтым баку польска-савецкай граніцы, як Машара, Танк, Васілёк і інш.

Да заганаў граматкі прадусім належаць даволі частыя пахібы граматычныя, што агулам ёсьць у кожнай кніжцы зьявай прыкрай, а тымбольш у кніжцы, празначанай для навучаньня граматы. Прадусім дужа шмат дзе не захавана аканьне, а так-жа кароткае і доўгае у. Спатыкаюцца пахібы лёгічна-граматычныя, напр.: „пашла мама з Бутрымам, Барбара" — няведама, што гэта знача; або: „Юры пасьвіць каровы". гэта мае быць—пасе каровы. Ёсьць і іншыя падобныя сказы. Бывае нявытрыманы правапіс: так напр. у вадным месцы ад слова есьці спатыкаем: еш, а ў другім — еж, а як правільна, дык і няведама. У дзеяслове з канчаткам на іць: дзяліць, хадзіць, касіць і г. д. у трэцяй асобе множнага ліку ў аўтара шмат дзе: юць, калі трэба — яць. Здараюцца русыцызмы: утаміўся — замест умарыўся, дрэмле — замест дрэме, не мараць — замест ня пэцкаць і інш. Дужа часта няправільна, разьдзельна пішуцца прыслоўі: з вечара, у радок, да рэчы, усё роўна й інш. Карэкта сям-там зрабіла прыкрыя неспадзеўкі, як напр. у вершы Машары „У хаце": „На палку, у кутку ля пячы": замест ля печы, не гаворачы ўжо аб розных іншых, менш важных, карэктарскіх недаглядах.

Аўтар усюды ўжывае: на Беларусі, здаецца нам, лепш ужываць: у Беларусі, на, хутчэй адпавядае частцы, а ня цэласьці. Здаецца нам так-жа, што і ў назове было-б лепш сказаць зярняткі, а ня зерняткі, бо зярнё больш у Беларусі пашырана, як зерне.

Спатыкаем у граматцы вобак з азбукай гражданкай і лацінку. Дужа гэта добра, бо пакуль у беларусаў фактычна йснуюць два шрыфты, патуль трэба нам знаць дзьве азбукі. Пры гэтай нагодзе трэба падчоркнуць патрэбу падобнай, ці й гэтай самай, адпаведна перарэдагаванай, граматкі лацінкай. Добры мільён беларусаў каталікоў, якія знаходзяцца пад сільным націскам польшчыны, будуць адстрашацца ад граматкі, друкаванай гражданкай, адвечным „доказам", што гэта „рускае", маскоўскае.

На заканчэньне астаецца яшчэ сьцьвердзіць, што „Першыя Зерняткі" — гэта сапраўды цэнная беларуская здабыча, і адначасна пажадаць, каб яна ня мінула ніводнай беларускай сялянскай хаты. Верым, што гэта станецца й што аўтару яе Сяргею Паўловічу ў хуткім часе прыдзецца рыхтаваць да друку, ужо перагледжанае й папраўленае, другое выданьне.

Кніжнік.

U Litoŭcaŭ

Palepšyła ekanamičnaje pałažeńnie. Nr. 25 „Viln. Ryt." sioleta piša: — Z pryčyny ekanamičnaha kryzysu na ŭsim świecie apošnimi tryma hadami kryzys hety adčuwaŭsia i u Litwie. Ale ciapier ekanamičnaje pałažeńnie ŭ Litwie značna palepšyła. Ab hetym wymoŭna świedča handlowy bilans z inšymi dziaržawami. Naprykład, sioleta ŭ lutym miesiacy Litwa pradała zahranicu tawaraŭ za 15,7 milijonaŭ litaŭ, u minułym hodzie ŭ tymža samym miesiacy — za 11 milijonaŭ i ŭ 1934 h. — za 13 milijonaŭ. Sioleta-ž, u tym-ža miesiacy lutym, zahranicaj Litwa kupiła za 8,9 milijonaŭ litaŭ, u minułym hodzie za 8,6 mil. lit. i ŭ 1934 h. — za 8,8 mil. lit. Takim čynam sioleta ŭ lutym miesiacy aktyŭ handlowaha bilansu Litwy byŭ 6,8 mil. lit., u minułym hodzie — 2,4 lit. i ŭ 1934 h. — 4,2 mil. lit.

Budzie 16 tamoŭ encyklopedyi. Jak wiedama, u Koŭnie wydajecca litoŭskaja encyklopedyja. Dahetul wydany 4 tamy (da litary C). Niadaŭna wyjšaŭ pieršy sšytok piataha tomu. Usiej encyklopedyi budzie 16 tamoŭ, jakija wyjduć u świet tolki za 8 hadoŭ.

*

Zakrytyja škoły. Nr. 15 „Viln. Ryt." siol. pisaŭ, što litoŭskich škoł „Rytasa" ad 1925 h. u našym krai da apošniaha času było zakryta 123, a ciapier toj-ža „Viln. Ryt." Nr. 31 padaje, što aprača henych škoł zakryta jašče za toj-ža čas 51 škoła „Rytasa" Świancianskaha.

Zakrywajuć čytalni „Rytasa". „Viln. Ryt." Nr. 31 piša, što lidzki starasta, z pryčyn biaśpiečnaści publičnaj, začyniŭ apošnim časam 9 litoŭskich čytalniaŭ.

Spyniajuć dziejnaść addziełaŭ T-wa św. Kazimiera. Jak widać ztaho-ž numaru „Viln. Ryt.", toj-ža lidzki starasta, z tych-ža pryčyn biaśpiečnaści spyniŭ niadaŭna dziejnaść 14 addziełaŭ T-wa św. Kazimiera.

Litoŭskaja delehacyja. 24 i 25 minułaha miesieca Staršynia Lit. Nac. K-tu ŭ Wilni K. Stašys i jaho zastupnik Kun. K. Čibiras byli jak delehaty ad litoŭskaha hramadzianstwa ŭ Ministerstwie Unutr. Spraŭ, dzie złažyli memorjał ab pałažeńni litoŭcaŭ u Polščy.

Wysiałajuć. Niadaŭna zahadam wilenskaha wajewody wysieleny z Polščy Kun. N. Raštutis, pašla byŭšy dyrektar himnazii M. Untulis, a ciapier taki-ž zahad wydany P. Karazii, dyrektaru litoŭskaha banku ŭ Wilni.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы! Дамагайцеся роднае беларускае школы!

З украінскага жыцьця

Што дала украінцам новая палітыка ў Польшчы? Гэткае пытаньне задае украінскі часапіс „Народная Справа" ў нумары 15 сёл. г. і дае адказ такога зьместу:

„...Здабыткаў пакульшто ня відаць... палітыка амаль зусім не зьмянілася, а палажэньне Украінцаў нават пагоршылася, галоўна з віны мясцовай адміністрацыі."

Украінская прэса пад Румыніяй. Цяпер Украінцы пад Румыніяй маюць 8 газэт: адна газэта штодзенная, пяць тыднёвікаў, адна двутыднёвая й адна месячная.

„Патрыятычнае" выхаваньне моладзі ў Сав. Украіне. Камуністычная газэта моладзі „Комсомольская Правда" падае справаздачу IX зьезду Камсамолу Украіны, у якой адзначана „патрыятычнае" вайсковае выхаваньне моладзі ў камсамоле Украіны. Гэтае патрыятычнае выхаваньне палягае на ўпаіваньні моладзі аб патрэбе абароны „соцыялістычнай бацькаўшчыны."

Krywawyja padziei ŭ Lwowie.

11 asob zabitych, 120 ranienych, 661 aryštawanych.

Na treci dzień Wialikadnia siol. u Lwowie padčas demanstracyi biezrabotnych byŭ ranieny rabotnik Ul. Kazak, jaki ŭ špitali pamior. Na pachowiny Kazaka sabrałasia masa narodu. Padčas chaŭturnaha pachodu natoŭp prarwaŭ łancuh palicyi, i pačałasia stralanina. Huk strełaŭ wyklikaŭ uzwarušeńnie, jakoje ŭzrastała pad widam ranienych i zdratawanych. Nie zważajučy na heta, chaŭturny pachod išoŭ upierad — jaho napirała wialikaja masa narodu. Uzdoŭž pachodu pasypalisia kamieńni ŭ wokny kramaŭ.

„Kurjer Waršawski" padaje, što padčas hetych zawarušeńniaŭ u Lwowie 11 asob zabitych i 120 asob ranienych.

Palicejskija j sudowa-śledčyja ŭłady rasśledźwajuć hetuju sprawu. U wyniku śledztwa aryštawana 661 asoba.

Polskija hazety, apiswajučy hetyja padziei, adznačali, što na płoščach Lwowa demonstranty nafadźwali wiecy, na jakich pramaŭlali aratary palsku i paukrainsku.

Liha Narodaŭ i wajna ŭ Afrycy

Z samaha pačatku italijanska-abisynskaj wajny ŭ Afrycy Liha Narodaŭ zaniałasia razhladam hetaj krywawaj raspravy i dasiul jašče ŭsio haworyć ab sposabach i mahčymaściach spynieńnia krywawaj bojki ŭ Afrycy. Italijancy hetym časam zabrali wialikuju čaść Abisynii i namahajucca zusim padbić amal biezbaronnych abisyncaŭ.

Apošnimi časami italijanskaja armija pačała ŭžo padychodzić až pad abisynskuju stalicu Addis-Abebu.

Dzieła wyjaŭlenaj biassilnaści Lihaj Narodaŭ u spynieńni italijanskaha krywawaha imperjalistyčnaha zachopnictwa Abisynii, Liha ŭ palityčnym świecie tracić swajo značeńnie i aŭtorytet.

Ciapier suproć italijanskaha imperjalizmu ŭ Afrycy rašuča pastawilasia Anhlija, jakaja daje Abisynii hrašowuju pazyčku i biassumniŭna pamoža aružžam.

Rašučaje stanowišča Anhlii, pakulšto, nia strymliwaje zachopnictwa italijancami Abisynii, ale tolki pahražaje nowaj wajnoj — anhielska-italjanskaj, jakaja moža pačacca na Siarodziemnym mory.

Słowam, pačataja wajna ŭ Afrycy moža pierakinucca j u Eŭropu.

Hišpanija na šlachu da balšawizmu

Niadaŭna ŭ Hišpanii adbylisia parlamenckija wybary, u jakich pieramahli lewyja i demokratyčnyja partyi, abjednanyja razam z kamunistami ŭ h. zw. „narodny front".

Wybary hetyja prajšli wielmi burna: spalena 68 kaściołaŭ, 72 asoby zabitych i 300 asob ranienych.

Rašučy lewy kurs unutranaj palityki.

Pašla wybarnaj pieramohi „narodnaha frontu" hišpanski ŭrad pawioŭ rašučy lewy kurs unutranaj palityki. Nasampierš raźwiazaŭ fašystoŭskija arhanizacyi j prawioŭ aryšty siarod fašystoŭskich dziejačoŭ. Aryštawana bolš 200 asob.

Baski damahajucca aŭtanomii.

Pasły z baskijskaj prawincyi padali ŭ hišpanski parlament prajekt aŭtanomnaha statutu dla Baskoŭ. Hety prajekt padpisali ŭsie baskijskija pasły.

Narady hieneralnych štabaŭ Anhlii, Francyi i Belhii

U źwiazku z apošnimi palityčnymi wystupleńniami Niamieččyny, jakaja adkinuła dasiulešnija swaje zabawiazańni padparadkawańnia Wersalskamu dahaworu i inšym mižnarodnym traktatam, hieneralnyja štaby zbrojnaj siły Anhlii, Francyi i Belhii pačali naradžacca, jak majuć spynić ewentualny wajenny pachod niamieckaha wojska.

Hetyja narady pačalisia 15 h. m-ca i prawodziacca ŭ wialikaj tajnaści.

Roznyja wiestki

ZHAZET.

Sawiety, Niamieččyna, Ukraina, Polšč i Biełaruś. Hazety ciapier wielmi časta kidajuć upierad roznarodnyja palityčnyja dumki. Hetyja palityčnyja dumki, kidanyja ŭpierad, časta datyčać i Biełarusi.

Francuskaja hazeta *„Je suis partout"*, razhladajučy palityku na ŭschodzie Eŭropy, miž inšym, piša hetak.

„Tak, t. Stalin nizašto nia choča wajny. Jon hatoŭ na suproć swaich kličaŭ — „my nikoli nie addadzim ani piadzi našaj terytoryi" — pakinuć Władywastok Japonii, a Ukrainu addać Niamieččynie, kali worahi sapraŭdy pakažuć „zuby" i kali Sawiety nia buduć čuć padtrymańnia z boku ženeŭskich pacyfistaŭ, jakija žadajuć krywi".

Hetki los warožyć francuski časapis Ukrainie. Warażbu ab losie Biełarusi znachodzim u polskim časapisie *„Goniec Warszawski"*, u jakim nadrukawana hutarka adnaho niamieckaha hienerała, hetkaha źmiestu:

Kali Niamieččyna pastanowić pačać wajnu z Sawietami, dla Polščy astanucca dwa wychady: a) Polšč astajecca neŭtralnaj, abo b) Polšč razam z Niamieččynaj abjawić Sawietam wajnu. U pieršym wypadku Polšč dobra zarabiła-b hrašmi, a ŭ druhim wypadku torytoryjaj—atrymała-b usiu Biełaruś".

Nu, ale heta tolki warażba—heta fantastyčnyja dumki roznych palitykaŭ. Žyćcio adnak silniejšaje ad fantastyčnych planaŭ i jano tworyć palityku.

Z POLŠČY

Karotkija, ale ważnyja palityčnyja wiestki. — Pašla źjezdu b. wajakoŭ, jaki nadowiečy adbyŭsia ŭ Waršawie, skanfiskawany adzin numar „pół-urzędowiej" „Gazety Polskiej".

— Ministr Matušeŭski zwolnieny z stanowišča staršyni kamisii ab addoŭžańni ŭ Radzie Ministraŭ.

— Urad daŭ adstaŭku krakaŭskamu wajewodzie Świtalskamu.

— Premjer Kaściałkoŭski raptoŭna adłažyŭ pajezdku i ŭ druhim terminie pajechaŭ u Budapešt.

Mahčymaja źmiena zahraničnaj palityki. Jak padajuć hazety, niadaŭna adbyłasia konferencyja prezydenta Maścickaha z hien. Rydzom-Śmihłym i ministr. zahr. spraŭ Bekam. Hetaj naradaj mocna zacikawilisia niamieckija palityčnyja kruhi, jakija dadumwajucca, što byccam polski ŭrad manicca źmianić swaju dasiulašniuju zahraničnuju palityku.

Niamieckaja hazeta „Volkischer Beobachter", abhawarwajučy henu konferencyju, ćwierdzić, što ŭ chutkim časie Polšč budzie šukać ciaśniejšaj suwiazi z SSRR. Adnačasna, pawodle dahadak henaj hazety, Polšč zbližyłasia-b da Čechasławaččyny i da pry-

Міхась Машара.

Лёгкі хлеб.

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

АКТ I.

Асобы першага акту:

Васіль Лаўручонак 25 г. сьлёсар. Прыехаўшы з гораду да бацькоў у госьці.

Рыгор Лаўручонак — яго бацька, стары селянін.

Ганулька — 25 г. прыгожая, вясковая дзяўчына, краўчыха.

Мар'яна — яе матка, старая жанчына.

Пятрусь, малады, стройны, вясковы хлапец.

Верачка — 20 г., вясковая „Цілігэнтка." Музыкі. Хлапцы і дзяўчаты.

—о—

Чыстая вясковая хата, справа ўходныя дзьверы і вакно. Стол, лаўка і два крэслы ля стала.

Злева дзьверы ў кухню, пры сьцяне старанна прыбраны дзявоцкі ложак.

У глыбіне кравецкая машына, на каторай Ганулька шые. Усюды сьляды яе работы: ласкуткі, кускі крамніны, сшытая і недакончаная вопратка, на крэсьле, на лаўцы і на стале.

Зьява 1-я.

Ганулька адна, шые. З кухні ўходзе Мар'яна.

Мар'яна. — Кідай працаваць, дачушка, ужо сьвята заходзіць.

Ганулька — Пачакай, пачакай, мамка! толькі вось сукенку Верцы скончу.

Мар'яна — Вось бяда! Або ў Веркі апрача яе няма чаго апрануць. Кончыш, абы здароўе.

Ганулька – Ну, ведаеш, мама, у багатых людзей сукенка якраз будзе патрэбна сяньня.

Мар'яна — (*парадкуючы матар'ялы*) Чаму так? Нашто яна ёй?

Ганулька — Гэта сакрэт. Бачыш, да Верачкі маюцца сяньня сваты прыехаць.

Мар'яна — А хто-ж такі? Адкуль тыя сваты?

Ганулька — Згадай, мама.

Мар'яна — Мо' Пятрусь Янкаў?

Ганулька — А, дзе там... Яна за Пятруся ня пойдзе.

Мар'яна — Чаму?! гэтакі хлапец! і прыгожы, і разумны, і жыць ёсьць нечым. Адзін у бацькоў. Бацькі ўжо старыя. Якога, ёй яшчэ, ліха трэба?

Ганулька — Так, так, мама. Усё гэта праўда... і Пятрусь яе надта кахае, ды вось, адна бяда, не да спадобы ён ёй.

Мар'яна — Вось што! А казалі, быў ужо крыху ладзіў з ёй.

Ганулька — Але, ладзіў, пакуль не зьявіўся гэты дарожны майстра.

Мар'яна — Які майстра?

Ганулька — А гэты, што на дарозе за прыганятага над людзьмі, пан Крукоўскі, ці, як у нас завуць яго, Крук.

Мар'яна (*У зьдзіўленьні кідае прыбіраць*). Дык за гэтага-ж за гэтага Крука Верачка лепш пойдзе, чым за Пятруся? Ты хіба жартуеш, Ганулька?

Ганулька — Бачу, што ў мамы не аднолькавы смак з Веркай, але ніякіх жартаў. Пятрусь хоць маладзейшы, і прыгажэйшы, але хлапец вясковы, а Крук — адукаваны, сьвятога вые. Адным словам „цілігэнт," як мама кажаш.

Мар'яна — Дык што з гэтага?

Ганулька — А Верцы такога і трэба, бо яна таксама на паненку хварэе; крыху вучылася, ну і хоча на лёгкі хлеб. А за Пятрусём трэба працаваць, ды яшчэ які—гаспадарка.

Мар'яна — Мне ня верыцца, далібог. Бо што тут з'яе такога? Адно, што багатага бацькі дачка, ды крыху павучылася ў нейкай там гімназіі, — дык ужо і на пенёнку хварэць? Дык ужо і цілігэнтка? Эт, дурасьць адна, ды й годзі! Я Пятруся на дзесяць Крукоў не памяняла-б.

Ганулька — Маме — так, а ёй места сьніцца і беспрацоўнае жыцьцё.

Мар'яна — Дык хай ідзе за Васіля Лаўручонка. Гэты таксама дэлікатны, разумны, і пасаду ў месьце мае і свой хлапец; не прыблуда які сусьветны.

Ганулька — Эт, мама пляцеш недарэчнасьці.

Мар'яна — Чаму? Ці-ж няпраўда? Ці-ж ён кепскі хлапец?

Ганулька — Праўда то праўда, але ня зусім...

Мар'яна—Чаму? Мо' і за яго ня пойдзе Верачка?

(д. б.)

baltyckich dziaržaŭ — Litwy, Łatwii i Estonii.

Marnawańnie skarbowych hrošaj. Wilenskaja hazeta „Słowo" Nr. 109 z dn. 21 krasawika sioleta ŭ artykule p. n. „Niačuwany skandał—marnawańnia milijonaŭ złotych" padaje, što ŭ Polščy ŭ 1928 hodzie bieskarysna wydana 22 milijony złotych na budowu Radomskaj Čyhunačnaj Dyrekcyi ŭ m. Chełmie Lubelskim. Budowa heta, raspačataja ŭ 1928 h., mieła być skončana za try abo čatyry hady. Pačałasia jana z nadta wialikim razmacham. U časie niapoŭnych 2 hadoŭ na abšary 50 haktaraŭ pabudawana 150 wialikich budynkaŭ, jakija ŭtwaryli 22 wulicy, 6 kilometraŭ ahulnaj daŭžyni, i mnoha daroh i šosaŭ. Apriača hetaha pabudawana 241 budynkaŭ prywatnych, koštam 2 mil. Takim čynam paŭstała cełaje nowaje miesta. Budowa hetaja była adnak chutka pierarwana i niedakončana až pa siańniašni dzień. Mnoha niedakončanych budynkaŭ stajać užo kala 8 hadoŭ pustyja i marnujucca. Chodziać čutki, što ŭ niekatorych miescach mury paščapalisia, a pad niezabiaśpiečanyja fundamenty padciakaje wada.

Ciapier hetaje nowaje miesta staić z zabitymi woknami niedakončanych damoŭ i nawodzić sum byccam wymieršaha horadu.

„Polski strajk". Apošnimi časami ŭ Polščy častawata adbywajucca strajki rabotnikaŭ, napr. strajk u Krakawie 23 sak. siol., Lidzki strajk, Lwoŭski i inš. Dziela hetaha stałasia aktualnaj sprawa „polskaha strajku", jaki palahaje na akupacyi fabryki. Urad byccam maje hetki strajk zabaranić.

Cikawa ab „polskim strajku" piša pawadyr P.P.S. Niedziałkoŭski ŭ haz. „Robotnik". Jon uważaje, što „polskim strajkam" polskija rabotniki baroniać ad źniščeńnia polski promysieł, jakomu pahražajuć časta zhubnyja plany mižnarodnaha kapitału i što hetym rabotniki baroniać nacyjanalnaha bahaćcia Polščy, jaje intaresaŭ i samastojnaści.

Z ZAHRANICY

Zmowa praciŭ Japonii ŭ Mandžuryi. Dnia 15 krasawika siol. japonskija ŭłady ŭ Mandžuryi wykryli procijaponskuju zmowu wyšejšych mandžurskich čynoŭnikaŭ. Mnoha aryštowana, miž inšymi, aryštawany hien. Linh-Šenh.

Wyzwolny ruch Bretoncaŭ. Dnia 18 krasawika siol. bretoncy zaniali niekalki miestaŭ u Francyi. Bretoncy damahajucca ad francuskich uładaŭ niezaležnaści Bretonii. Palicyja mnoha zbuntawanych bretoncaŭ aryštawała. Hazeta „Ekscelsior" padazraje, što bretoncam materjalna pamahajuć niamieckija nacyjanał-socyjalisty.

Nowy prezydent Łatwii. 16.II. siol. prezydentam Łatwii na miesca Kwiezisa staŭsia Ulmanis. Źmiena hetaja, pawodle słoŭ nowaha prezydenta Łatwii Ulmanisa, maje być astatnim etapam reformy łatwijskaj konstytucyi, raspačataj u 1934 h.

Z KRAJU

„Razbrajeńnie". Wilenski wajawoda Bacianski wydaŭ adozwu-zahad, kab ludzi addali ŭładam aružža i amunicyju. Palicyja ŭ niekatorych pawietach prawodziła ŭ žycharoŭ rewizii, šukajučy zbroi, a znajšoŭšy, zabirała jaje. Hetkaje „razbrajeńnie" prawodzicca dalej.

Samahonka. Apošnimi časami palicyja mnoha dzie wykrywaje tajnyja brawarki samahonki. Za samahonku sudy karajuć wielmi sroha.

Выпісывайце! Чытайце!

„КАЛОСЬСЕ"

Друкуецца і выйдзе ў сьвет у палавіне траўня кніжка 2 (6) гэтага беларускага літаратурна-навуковага часапісу.

Прысланыя да 1-га траўня ў літаратурны і навуковы аддзелы, а такжа ў аддзел — хронікі матарыялы могуць быць зьмешчаны яшчэ ў гэтай кніжцы часапісу.

Складка на часапіс у год — 4 зл.
На асобную кніжку — 1 зл.

Адрас: рэд. і адміністрацыя „Калосься" — Вільня, Завальная 1—2.

З беларускіх газэт

Барацьба за родную школу.

Справа роднае беларускае школы ніколі ня сходзіла з бачын беларускіх газэт, а цяпер, калі сярод беларусаў паўстаў супольны фронт дзеля дамаганьня роднай школы, яна набірае асабліва важнага значэньня.

Супроць агульна-беларускага школьнага фронту заўзята выступаюць беларускія полёнафілы ў газэце „Родны Край", выстаўляючы беларускаму народу, замест роднай школьнай і зашкольнай асьветы, сваю праграму Т.Б.А., у якой сказана, што яны стаяць за... пазнаваньне польскае культуры.

Беларускі народ знае цану „Роднага Краю" й ведае куды хоча нахіляць беларусаў Т.Б.А., дык выступленьні „нашых" полёнафілаў разыходзяцца, як пусты гук.

Пры гэтым, напамінаем усім беларусам, каб, падаючы дэкляpацыі на беларускую школу, высьцерагаліся ўсялякай правакацыі й паступалі толькі паводле інструкцыі, як дамагацца дзяржаўнай публічнай беларускай школы на падставе закону ад 31.VII.1924 г. і распараджэньня Міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы ад 7.I.1925 г., выданьня Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры й Таварыства Беларускае Школы.

Беларускі Нацыянальны Камітэт—беларускі народны фронт.

Маладая „Наша Воля" у нумары 6(7) з 12 красавіка 1936 г., год 1 выданьня, ужо зразумела, што: „Беларусы — сяляне, работнікі, рамесьнікі й інтэлігенты пачынаюць разумець, што нядоля сяньняшняга дня злучае людзей фізычнай і ўмысловай працы да барацьбы за сьветлую лепшую будучыню Беларускага Народу".

Але яшчэ гэтая „Наша Воля" ня можа сьцяміць, што дзеля, вышэй успамянутай, барацьбы за лепшую будучыню Беларускага Народу заснаваўся больш 15 гадоў таму беларускі народны фронт—Беларускі Нацыянальны Камітэт, пад бел-чырвона-белым сьцягам каторага аб'еднываліся калісь „Грамада", Б.Х.Д., „Сялянскі Саюз" і іншыя беларускія арганізацыі; цяпер аб'еднываюцца йснуючыя партыі: Б.Н.А., Б.Н.С. і другія беларускія арганізацыі, якія далейшым цягам твораць гэты гістарычны беларускі народны фронт — Б. Н. К-ту, супроць якога ў апошнім нумары „Н. В." выступілі, каб яго разьбіць, нашаволяўскія „малайцы".

Гэтыя „малайцы", як даецца заўважыць, пачынаюць „рэвалюцыйную" барацьбу з існуючымі беларускімі арганізацыямі так, як „маладыя" ў „Маладой Беларусі" павялі барацьбу супроць старэйшых.

Каму гэткае разьбіваньне беларусаў патрэбнае?

„Сьветач Беларусі".

Надовячы выйшаў нумар 9 пятага году выданьня „Сьветача Беларусі". Гэта часапіс праваслаўнацаркоўных полёнафілаў. У гэтым нумары царкоўныя полёнафілы выступаюць супроць царкоўнай расейшчыны, памагаюць бядаваць ніжэйшаму клеру й крытычна ставяцца да вышэйшай царкоўнай улады.

р—к.

Адкрытае пісьмо.

Я сябра Цэнтр. К-ту БНА гэтым далучаюся да выступленьня сяброў Малецкага, Багдановіча і Шутовіча ў справе папраўкі 29 і 34 артыкулаў нашай праграмы.

Б. Гапановіч-Бабарыка.

17.IV.1936

Пісьмы з вёскі

КУЛЬГАІ, Празароцкай вол. Нашыя сяляне сёлета пачалі пераходзіць на хутары. Адна толькі бяда з гэтымі хутарамі. Найгоршая справа з перабудоўкай. Асабліва ў цяжкім палажэньні апынуліся тыя, што маюць вельмі старыя будынкі й мусяць іх пераносіць з вёскі на свой хутар. Купіць дзерава на новыя будынкі няма магчымасьцяў, а пераносіць гнілыя будынкі, гэта проста хоць плач. Часьць нашых гаспадароў дастала сабе хутары — па некалькі гактараў няўжыткаў, неразараных лядаў, з адным мохам ды кустамі. На гэтакіх хутарох ёсьць некалькі гаспадароў, што ня маюць ні каня, ні плуга, ні бараны. Ствараецца палажэньне надта цяжкое. Адзін селянін Васвадка з прычыны благога стану сваей гаспадаркі пакончыў з сабой нават самагубствам. Гэта аднак ня выхад для ўсіх. Усе сяляне не павінны паддавацца свайму гору, а ўсімі сіламі павінны змагацца за лепшую сваю долю.

У Кульгаёх ад 1930 году йснуе польская арганізацыя „Коло Млодзежы Вейскей." Да яе належыць беларуская, нацыянальна сьведамая моладзь і ў ёй праводзіць сваю работу. Дня 15.II.1936 г. сябры гэтага кола, сьведамыя беларусы, зладзілі беларускае прадстаўленьне, на якім адыгралі п'есу „Пярэстая Красуля." Людзей на прадстаўленьні было многа, усе з вялікай радасьцю слухалі роднага слова са сцэны. П'есу адыгралі артысты-аматары добра, найлепш гралі, з дзяўчат: Вольга Лінкевічанка й Зіна Глацянка, з хлапцоў: Сяргей Хрыпач і Антон Фядзкавіч.

Гэтая-ж самая моладзь рыхтуецца цяпер да новага беларускага прадстаўленьня, хоча паставіць „Суд" і „Паўлінку."

Жадаю ёй памыснасьці ў працы на карысьць беларускага народу! *Гіндзін.*

БЫЧЫНШЧЫНА, Маладэчанскага пав. Нашая вёска малая, мае ўсяго 20 жыхароў. Усе па нацыянальнасьці беларусы, толькі маласьведамыя. Арганізацыяў у нас ні сваіх, ні чужых няма. Сяляне амаль усе пісьменныя. Некаторыя ахвотна чытаюць „Беларускую Крыніцу" і надта цікавяцца беларускім адраджэнскім рухам. Некаторыя аднак марнуюць час і сваё дабро на йгру ў карты. Нашыя карцёжнікі надта шчыра ўзяліся за йгру ў карты. І так яны заўзята йграюць, што адзін з іх прайграў нават свой варштат працы і то не зараз, але пакрысе, кожную нядзелю па аднэй прыладзе. Так прайграўшыся, застаўся сам гол, як кол.

Браты Беларусы! сорамна так рабіць, кіньце карты — гэтую нашую згубу, лепш падумайце, як нам папрaвіць сваё гаротнае жыцьцё. Чытайце беларускія кніжкі і часопісы, дамагайцеся адчыненьня роднай школы для сваіх дзетак!

Міхась Салавейка.

HIŠČAWIČY, Wialejskaha paw. Wioska Hiščawičy wialikaja, składajecca jana z 80 chat. Žycharami jaje źjaŭlajucca biełarusy, ale zusim nacyjanalna niaświedamyja. Nikoli nie piajuć swaich rodnych pieśniaŭ, nia čytajuć biełaruskich hazetaŭ i naahuł nia cikawiacca biełaruskaj sprawaj.

Braty! čytajcie biełaruskija knižki i hazety, jany was ŭświadomiać i nacyjanalna i socyjalna, jany wam skažuć, što wy, biełarusy, naležycie da 12 milijonnaha Biełaruskaha Narodu, jaki, tak jak i inšyja narody, maje prawa na samastojny, niezaležny ad nikoha byt. My nie pawinny wyrakacca swajho rodnaha, ale pawinny jaho šanawać i lubić. Našym najbolšym abawiazkam jošć baranić swoj nacyjanalny honar, swaje nacyjanalnyja j hramadzkija prawy. Kali ŭsie biełarusy zhodna, stojka, achwiarna buduć pracawać dla dabra swajho mnohapakutnaha narodu, dyk nie siańnia, to zaŭtra „zahlanie sonca i ŭ naša wakonca!"

Jakub Čyžyk.

HUTA, Lidzkaha paw. Žychary wioski Huty ŭsie biełarusy j haworać tolki pabiełarusku. Zachoŭwajuć jany ŭwa ŭsim roznyja staryja biełaruskija zwyčai j abyčai. Najbolš šanujuć i lubiać rodnuju pieśniu, jakuju piajuć pry pracy ŭ kožnuju paru hodu, padčas hałaŭniejšych mamentaŭ u žyćci čaławieka, prykładam chreśbiny, wiasielle j inš., padčas świataŭ, asabliwa bolšych, jak Kalady, Wialikdzień i h. d. Sioleta na Wialikdzień našaja moładź taksama śpiawała biełaruskija wialikodnyja pieśni, jak pa wioskach, tak i pa miastečkach, asabliwa ŭ m. Subotnikach. Rodnaja pieśnia heta nierazłučnaja tawaryška ŭ žyćci sielanina. Jana jamu ablahčaje pracu, paciašaje jaho ŭ roznych biedach i ciažkim hory. Abawiazkam kožnaha biełarusa pawinna być pašana swaje narodnaje pieśni, jakaja źjaŭlajecca adbitkaj sialanskaha žyćcia.

Apriača dobrych zwyčajaŭ, zachoŭwajucca ŭ nas tak-ža j błahija prywyčki, da katorych naležyć pradusim pićcio harełki. Chacia ciažka stała žyć biełaruskamu sielaninu, časta celymi dniami žywie jon biaz chleba, adnak biez harełki niejk nia moža abyjścisia. Kali nia maje ani hraša, kab kupić harełki, dyk honić samahonku. Za heta časta papadaje ŭ astroh. Naahuł harełka heta našaja wialikaja zhuba, prynosić jana nam upadak i materjalny i maralny.

Dziela heta źwiartajusia da swaich siermiažnych bratoŭ z haračym zaklikam, kab jany zyjšli z błudnaj darohi i hlanuli na lepšaje, światlejšaje žyćcio. Kab nie marnawali swajho dabra na harełku, a lepš uzialisia za swaju rodnuju biełaruskuju knižku j hazetu!

Hucienski.

NOWYJA-ŠARABAI, Hłybockaj woł. Dziśnienskaha paw. Narod naš z pryčyny ciemry j niaświedamaści, z pryčyny ciažkoha materjalnaha pałažeńnia prosta dzičeje. Woś adzin z mnohich faktaŭ, šyroka ciapier raspaŭsiudžanych na našych ziemlach, jaki świedčyć ab demoralizacyi biełaruskaha sialanstwa:

U niadzielu 29 sakawika sioleta piacioch złosnych ludziej napali na Kuryłowiča Illu j chacieli jamu parezać sietki, jakija jon pilnawaŭ la woziera. Kali Kuryłowič supraciŭlaŭsia, dyk jany kinulisia na jaho z kamieńniami j nažami, mocna jaho pabili j parezali, čuć nie zabili na śmierć.

Sprawaj hetaj zaniałasia palicyja.

K. S.

Naša pošta

S a ł a w i e j k a. Za karespandencyju dziakujem, drukujem. Wierš da druku nie padchodzić. Pišycie karespandencyi.

H u c i e n s k i. Atrymali, dziakujem, karystajem. Padawajcie deklaracyi za rodnuju školu.

H i n d z i n. Wašyja karespandencyi drukujem, pišycie bolš.

S t. K. Atrymali i karystajem, pišycie čaściej.

L a w o n Š. Dziąkujem, karystajem, pišycie čaściej.

A n d r e j. Piśmy atrymali, skarystajem, pišycie ab žyćci sialan u wašaj wakolicy.

Выйшаў з друку і прадаецца ўложаны С. Паўловічам новы беларускі ілюстраваны лемантар пад наз.

„Першыя Зерняткі"

беларуская граматка для хатняга навучаньня. З многімі малюнкамі У. Паўлюкоўскага, Я. Драздовіча і іншых. Выданьне Я. Малецкага. Бачын 96, фармат 8°. Ёсьць гэта прыгожая кніжыца для дзяцей і старэйшых. Купіць можна ў кожнай беларускай кнігарні ў Вільні і на правінцыі. Цана пры выпісваньні з перасылкай: да 10 экз. па 50 гр., ад 10 да 20 — 45 гр., ад 20 да 50 — 40 гр., ад 50 і ўзвыш — 35 гр.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „Пагоня" Вільня, Завальная 1.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič